**YouPEC** | European Youth PErspective Conference on Biodiversity

## Асноўныя вытрымкі з Дэкларацыі

150 актыўных маладых людзей з 35 еўрапейскіх краін сабраліся разам у г. Джыл, Бельгія, для ўдзелу ў 3-й еўрапейскай маладзёжнай канферэнцыі, каб падыскусіраваць аб праблемах захавання біялагічнай разнастайнасці. Як моладзь, мы занепакоены нашай будучыняй і будучыняй наступных пакаленняў, паколькі страта біялагічнай разнастайнасці, выкліканая антрапагеннымі фактарамі, на іх акажа негатыўнае ўздзеянне. Кожны чалавек павінен супрацьдзейнічаць дэградацыі біяразнастайнасці. Аднак, асноўныя прычыны памяншэння біяразнастайнасці не могуць быць вырашаны на асабістым узроўні. Мы маем патрэбу ў вас, асобах, прымаючых рашэнні сягоння, каб прыняць меры супраць крызісу біяразнастайнасці зараз.

Біяранастайнасць вельмі важная кожнаму чалавеку для забеспячэння запасам харчу, чыстай вадой і агульнагачалавечым дабрабытам. Цэннасць гэтых важных паслуг не можа быць недаацэненая. Знікненне разнавіднасцяў у наш час адбываецца ў 1000 разоў хутчэй, чым раней. Унікальная цэннасць біяразнастайнасці павінна быць захавана для будучых пакаленняў. Вось чаму біяразнастайнасць з'яўляецца неацэннай для кожнага.

У 2001 годзе Еўрасаюз паставіў мэту спыніць страту біяразнастайнасці да 2010 года, мэту, якая не была дасягнута. Мы прызнаем прагрэс Еўрапейскага саюзу ў яго палітыцы біялагічнай разнастайнасці, аданак палітыка пакуль што была непаспяховай з-за дрэннага выканання заканадаўства, недастатковага фінансавання, недахопу разумення, палітычнай гатоўнасці і ведаў. Прапанаваныя новыя мэты ЕС на 2020 год і іх бачанне на 2050, мы, прадстаўнікі еўрапейскай моладзі, прызываем усіх асоб, прымаючых рашэнні, разгледзець і ажыццявіць выкананне наступных рэкамендацый для спынення страты біяразнастайнасці:

- Пашыраць веды аб біяразнастайнасці праз адукацыю і набліжэнне людзей да прыроды.
- Стварэнне сеткі Натура 2000 з'яўляецца сапраўды значным дасягненнем Еўрапейскага саюзу, але мы павінны гарантаваць, што асяроддзе абітання і Дырэктывы птушак належным чынам ажыццеўлены дзяржавамі-членамі.
- Удасканаліць маніторынг і навуковыя даследаванні стану і тэндэнцый біялагічнай разнастайнасці Еўропы.
- Спыніць страту асяроддзя абітання і пашырыць існуючыя плошчы, занятыя "дзікай прыродай", шляхам пабудовы "зялёнай" інфраструктуры.
- Мы пераконваем Еўрапейскі саюз працягваць рэфармаванне САР, з мэтай змяншэння перавытворчасці і ўзмацнення аховы біялагічнай разнастайнасці праз устойлівае выкарыстанне сельскагаспадарчых і пастаральных зямель.
- Павінна быць уведзена аснова ўстойлівасці мераў, якая неабходна, каб фермеры падтрымалі мінімальныя стандарты, як перадумову для атрымання фінансавых сродкаў, "грамадскія грошы для грамадскіх тавараў".
- Фінансаванне вельмі важна для абароны біяразнастайнасці і павінна быць павялічана да належнага ўзроўню неадкладна. Як мага хутчэй павінны быць выключаны шкодныя субсідыі.
- Варта аддаць перавагу інтэграцыі біяразнастайнасці ў іншую палітыку, такую, як сельская гаспадарка, лесакарыстанне, землекарыстанне, адаптацыя і памяншэнне змянення клімату.
- Прыватны сектар, бізнес і іншыя павінны развіваць інавацыйную "зялёную" эканоміку, якая стымулюе дабрабыт і памяншае негатыўныя ўздзеянні на экасістэмы.
- Еўрапейскіаму саюзу і кіраўніцтву Бельгіі неабходна прадэманстраваць лідэрства на CBD COP10 у г. Нагоя і засяродзіць увагу на забеспячэнні выканання глабальных мэт на 2020 і амбіцыйных перспектыў на 2050, у тым ліку прыняцце ўсебаковага пратакола па падзелу выгад і доступу.

2010 год – міжнародны год біяразнастайнасці. Мы павінны скарыстаць магчымасць і зрабіць гэты год паваротным у палітыцы біяразнастайнасці. Зараз час для дзеяння. Вы, сягонняшнія лідэры, будзьце ўпэўнены, усё яшчэ ёсць прычына, каб быць лідэрамі заўтра.